Барацьба за тэрытарыяльную незалежнаць.

Барацьба… Я, мабыць, зараз скажу неверагодна банальную рэч, але ўсё жыццё чалавека — гэта барацьба: барацьба за інтарэсы, мары, жаданні.

Я бы магла зараз узяць і напісаць нешта накшталт «мая барацьба, ці як я дасягнула таго, чаго я дасягнула». Але каму гэта патрэбна? Па шчырасці, мяне ў апошні час пачала адольваць нейкая абыякавасць да таго, чым я займаюся. Без энтузіязму прыходжу ў ліцэй, выпадаю з сацыяльных сетак на адзін-два дні. Які сэнс у тваім маленькім свеце, калі некалькі гадзін на машыне—і ты пад гарматнымі стрэламі?

Нядаўна я перачытала «Каласы» Караткевіча… Чацвёрты раз за апошнія некалькі месяцаў. Падаецца, я разумею, чаму яго не зрабілі Народным пісьменнікам. Канешне, гісторыя падрыхтоўкі паўстання не такая «правільная», як «шамякінская «Санта-Барбара»». Цікава, на тэму гэтага эсэ мяне падштурхнулі не сённяшнія навіны, не песні Вольскага і нават не БТ, а цытата з кнігі, напісанай напрыканцы 60-х гадоў. Цытата чалавека, які так і не дажыў да незалежнай (можа хоць і дэ юрэ) Рэспублікі Беларусь Але нешта мне падказвае, што я таксама не дажыву...

«Зямлёй і людзьмі рухае дух змагання. Я не ведаю, ці ёсць у гэтага змагання нейкая надзея. Але з веку ў век людзі змагаюцца. І таму яны—людзі,а не быдла»

Добра пераплятаецца з тэмай задання, згодныя? Навошта нам Камю, калі ёсць свой Караткевіч?

Змаганне… У апошні час я так часта чую гэта слова, нават часцей за «стабільнасць». Які ж мы пакутлівы народ. За ўсе гады свайго існавання мы змагаліся — змагаліся за тэрыторыю, за мову, за права звацца беларусам. Зямля —гэта, па-мойму, самая вялікая каштоўнасць беларуса, маем на ўвазе мы тэрыторыю краіны ці невялічкі надзел менавіта СВАЁЙ зямлі, аб якой так марылі Міхал ці Васіль Дзятлік. Я б магла зараз напісаць пра суседнюю краіну, якая з мужнасцю адстойвае сваю зямлю і незалежнасць, але ж і мы таксама ўжо больш за тысячу гадоў змагаемся за сваю тэрыторыю.

Усю сваю гісторыю мы баранілі гэты кавалачак зямлі, што распасцерся ад «Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Мінськ, Магілёў, Вільня». Няўжо гэты «край загадак і цудаў» настолькі цудоўны, што яго марыць прыбраць усе, хто калісьці межаваў з ім? Не ведаю, што наконт іншых, але для беларуса зямля— гэта менавіта той цуд, за які ён будзе біцца да апошняга. І біліся. З Масквой, з крыжакамі, з Польшчай, з Расеяй. І страчвалі мы зямлю, а з ёй і сябе.

Што такое зямля? Гэта тое, што дае нам права называцца гаспадарамі свайго жыцця. Мы вагаемся паміж захадам і ўсходам, таму што і тое, і тое для нас чужое. Але мы вольные абіраць тое, што мы хочам абраць. А дзе гэта рабіць, як не на сваёй зямлі? Свая тэрыторыя— адзін з самых галоўных крытэрыяў свабоды. Чалавеку немагчыма жыць пад прыгнётам, калі не даюць самому абіраць каштоўнасці, веру і парадкі.

«Прыгнёт нараджае не толькі рабоў. Са слабых - магчыма. Але з моцных ён нараджае волатаў»

І з’яўляліся тыя волаты, якія вялі да свабоды, да сваёй зямлі. Зараз мы з гонарам заяўляем пра Касцюшку і Каліноўскага, лічым іх народнымі героямі (нават калі некаторыя канторскія пацукі прапаноўваюць выкінуць іх імёны з нечага, падобнага да школьнага падручніка па гісторыі). Але, на жаль, рабоў і баязліўцаў было больш. Як і здраднікаў. Ах гэта беларуская мяккацеласць і жаданне пазбягаць канфліктаў. Лепш сядзець перад чорнай скрынкай і прыгаворваць «абы вайны не было».

Таму і прадавалі мы зямлю то палякам, то расейцам. Бо лічым сябе тым племенем быкаўскіх насарогаў, якому лепш адкупіцца, чым выклікаць гнеў кагосьці, хто выглядае мацнейшым за нас.

Вось пішу гэтыя радкі, а ў галаве ўсплывае японская карыкатура Першай сусветнай вайны. Расійскую імперыю адлюстравалі праз асьмінога, які сваімі шчупальцамі заграбаў усё, што трапляла на вока. А ў нашай гісторыі такіх асьміногаў было шмат. І кожны спрабаваў забраць сабе кавалак.

Хай мне кажуць, што гэта юнацкі максімалізм і што гэта хутка скончыцца. Але я баюся, што аднойчы прачнуся і пачую, што такая краіна, як Беларусь, перастала існаваць. Затое з’явіўся новы «автономный округ» ці «край». Я не магу перадаць той гонар, які ахоплівае мяне, калі нехта смела заяўляе пра тое, што ён беларус. Як часта я сустракала людзей у сваім асяроддзі, якія саромеюцца сваіх каранёў, сваёй краіны і мовы. Не дзіва, калі на працягу стагоддзяў беларусаў лічылі не вартымі называцца нацыяй.

Мне падаецца, што праз гісторыю Беларусі можна добра прасачыць гэту гегелеўскую цыклічнасць. Мы перажываем усе этапы зноў і зноў, наступаем на адны і тыя ж граблі. Як ніколі мы блізкія да таго, каб страціць не толькі сваю тэрыторыю, але і сваю нацыянальную самасвядомасць. Але мы змагаемся. І будзем змагацца, пакуль існуе гэта вера ў свабоду, вера ў незалежную Беларусь. Таму што менавіта змаганне за свабоду і незалежнасць надае сэнс чалавечаму жыццю.